случаях даже отсутствие каких либо поясняющих надписей позволяет по одному изображению адекватно судить о предмете.

Анализ существующих тестовых заданий с графической формой представления информации дает возможность утверждать о целесообразности максимального насыщения тестовых заданий графической информацией.

Наличие *графического изображения* (принципиально не столь важно какого, но адекватно отражающего характерную особенность самого предмета), позволяет составить максимально полное представление о предмете, что приводит, в конечном итоге, к осознанно правильному ответу на вопрос теста.

Г*рафическое изображение* в вопросе теста активизирует зрительную память, что позволяет составить целостное представление о предмете, соотношении его составляющих компонентов, частей, узлов, единиц, что ведет к осознанному ответу и уменьшает вероятность угадывания ответа.

Необходимо отметить одно важное обстоятельство, имеющее принципиальное значение для всех видов тестов - для получения верного и, главное, осознанного студентом ответа на поставленный тестовый вопрос необходимо максимально *полно* и в *корректной форме дать представление о предмете и того,* что мы хотим получить в ответ (*достоверно и в соответствии со знаниями* студента.

Список литературы


1. Словарь-справочник по черчению: Кн. для учащихся/ В.Н. Виноградов, Е.А. Василенко, А.А. Альхименок и др.-2-е изд., перераб. и доп.-М.: Просвещение, 1999.-160 с.: ил.
2. Антонов, А.В. Восприятие внетекстовых форм информации в издании. М.: «Книга». 1972.-103с.
3. Виноградов, В.Н. Черчение. Техническая графика: Учебник для общеобразовательной школы с русск. яз. обучения. Мн.: Нар. Асвета, 1999.-191 с.


## ГІСТОРЫЯ, ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ ТЭХНАЛОГІІ ВЯЗАННЯ, АБО ПЛЯЦЕННЕ ТЭКСТЫЛЮ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ


*Г.А. Бабровіч, Н.А. Бабровіч*

*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя адзначыліся імклівым ростам цікавасці да гісторыі традыцыйнай культуры і, у прыватнасці, дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва. Асабліва актуальнай становіцца праблема захавання народнага мастацтва, якая набывае новы аспект у сувязі з урбанізацыяй і тэхнічным прагрэсам. Змена выявы жыцця, разбурэнне традыцыйнай серады пасялення і скарачэнне колькасці сельскага насельніцтва, як носьбіта традыцый мінулага, падрывае асновы натуральнага механізму захавання і перадачы асноў нацыянальнай культуры. Гістарычныя традыцыі займаюць усё менш месцы ў паўсядзённым жыцці сям'і, лакальнай супольнасці. Сёння яшчэ маюцца асобныя тэрыторыі, селішчы, дзе захаваліся носьбіты аўтэнтычнай традыцыйнай культуры, якую, аднак, няма каму перадаваць, бо там не застаецца моладзі або адсутнічае цікавасць да культуры мінулага. Таму ўзнікае вострая неабходнасць фіксацыі таго, што захавалася ў памяці носьбітаў традыцыі, падтрыманні і ажыўленні традыцыйнай народнай творчасці. Мэта даследавання: аналіз гісторыі развіцця тэхналогіі вязання, на Віцебшчыне з моманту яго ўзнікнення і да сучаснасці, выяўленне характэрных асаблівасцяў гэтага працэсу.



Репозиторий ВГУ

**Матэрыял і метады.** У працы выкарыстоўвалася сукупнасць тэарэтычных і эмпірычных метадаў даследавання: тэарэтычны аналіз і сінтэз эмпірычных дадзеных; тэарэтыка-метадалагічны аналіз педагагічнай і гістарычнай літаратуры; эмпірычныя, прыватныя метады (вывучэнне дакументаў).

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Дакладна не вядома, калі з’явілася вязанне на тэрыторыі цяперашняй Віцебшчыны, але некаторыя вынікі па фактах археалагічных даследаванняў на сённяшні час мы маем. У VIII – VII стагоддзях да н. э. на поўначы Беларусі складваецца своеасаблівая група ўсходнебалцкіх плямёнаў, якія разам з плямёнамі Смаленскага Падняпроўя і поўдня Пскоўскай вобласці ў раннім жалезным веку стварылі адзіную днепра-дзвінскую культуру, якая праіснавала да IV–V стагоддзяў н. э. Прадукцыйнасць палявання і рыбалоўства, навыкі ў захаванні прадуктаў, а таксама з’яўленне земляробства абумовілі пераход да аседлага ладу жыцця, а апошняе вызначала абмежаванне гаспадарчай дзейнасці тэрыторыяй невялікага мікрарэгіёна. Жыхары гарадзішчаў займаліся і пляценнем, якое мела ў гаспадарцы важкае значэнне, – выраблялі сеткі і рагожкі. Навукоўцы лічаць, што так званыя грузікі “дзякавага тыпу”, з’яўляюцца часткай прыстасавання для выпрацоўкі тэкстылю спосабам пляцення. Сярод вельмі распаўсюджаных касцяных прылад працы вядомы качадык для пляцення з лыка або шнура, які выкарыстоўваўся для падымання аднаго кампаненту пляцення, каб прапусціць спаднізу другі ў папярочным накірунку. Магчыма, ужо тады рабілі і абутак накшталт лапцей?

Так, з часоў фарміравання археалагічнай днепра-дзвінскай культуры аж за другую трэць XX стагоддзя мужчыны, як і раней на Паазер’і, вязалі рыбацкія сеткі з дапамогай чаўнака (ігліцы) і дошчачкі (мал.1, 2).


Мал.1. Пляценне сеткі. Х. С. Жывета і М. Галец – працаўнікі рыбацкай арцелі, 1940-я гады, в. Ст. Лепель.


Мал.2. Х. С. Жывета (в. Ст. Лепель). Рыбацкая сетка, плеценая з ільняных нітак. 1940-я гады.

Такія ж сеткі (філе), нацягнутыя на раму, аздабляліся жанчынамі вышыўкай насцілам з каляровых шарсцяных нітак і ўжываліся як абрусы, сурвэты, пакрывалы. Філейныя сеткі для вырабу вышыванага дэкаратыўнага інтэр’ернага хатняга тэкстылю таксама вязалі і кручком, а спосабы сеткавязання, або вузельчыкавага пляцення, знайшлі новы шлях бытавання і выкарыстоўваюцца сучаснымі майстрамі ў ручным вырабе сеткавага палатна (гамакі, сеткі для спартыўных гульняў).

Вядомы мясцовы краязнаўца М.Я. Нікіфароўскі ў сваёй працы паведамляе: “Суконныя сученыя нитки изъ худшей шерсти, “быковинъ и подпуззя”, и идутъ на “испотки, носки и чулки, выпрядаются отдёльно отъ ткацкихъ, парными “ручайкыми”, трощатся на клубокъ и сучатся исключительно веретеномъ… Въ немногихъ домахъ, гдё водятся “трусы” (кролики), или гдё умеютё пользоваться козьимъ пухомъ, старательно выщипываемымъ во время линьки, прядется кроли-

Репозиторий ВГУ

чья и козья шерсть, изъ нитей которыхъ вяжутся потомъ “испотки”, преимущественно въ кожаныя рукавицы… Прядиво ваты (“бавэлны”) встрѐчается такъ рѐдко, что многія пряхи не имѐютъ о нем даже и понятія. Тѐмъ не менѐе въ пришляхетныхъ мѐстахъ “бавэлниныи” нитки домашняго производства идутъ на утокъ, на пояса, или же изъ нихъ вяжутся кое-какія пятипалыя перчатки. Единственным вязальнымъ снарядомъ служатъ ”прутки” – покупныя спицы наибольшей толщины. Чаще всего такими “прутками” бываютъ прутиковые спицы, посильно отструганныя и отглаженныя” [1].

Па літаратурна-краязнаўчых звестках за 1902 год: “Дѐвушки должны умѐтъ прястъ и ткатъ разные холсты и сукно и кое-какъ шитъ, т. е. умѐть пошить себѐ и мужу бѐлье… Другихъ рукодѐлій бѐлорусскія крестьянки совсѐмъ не знаютъ, по крайней мѐрѐ въ Витебской губерніи ни одна даже не умѐетъ вязать чулковъ, въ нѐкоторыхъ мѐстностяхъ вяжутъ крючкомъ самыя простыя кружева, которыми обшиваютъ себѐ воротники и передники” [2].

Як бачна, парасткі мясцовых сялянскіх традыцый вязання кручком укараніліся дзесьці каля мяжы XIX–XX стагоддзяў.

Па звестках старажылаў з паўночна-ўсходняй часткі Віцебшчыны вядома, што жанчыны, якія нарадзіліся прыкладна да 1920 года, маглі не ўмець пісаць, але абавязкова ўмелі прасці, ткаць на кроснах палатно і вязаць тамбурам карункі і на 5-ці прутках, без ніякіх узораў (калі толькі каляровыя палосачкі-“шлячкі”), шкарпэткі і ісподкі. Яны ў дзяцінстве паспелі пераняць гэта майстэрства ад маці ці бабуль і прадаўжалі некаторы час рабіць ўсё амаль як і ў ранейшыя стагоддзі, ва ўмовах хатняй сялянскай гаспадаркі, а іх малодшым сёстрам давялося вычыцца ў школе і далей атрымліваць адукацыю ці адразу працаваць у калгасе...

Крыху пазней прыйшлі часы карэнных перамен і на тэрыторыі, якая стала сучаснай Заходняй Віцебшчынай. Дзяўчаты з пакалянння 20-х гадоў XX стагоддзя і пазней не трымаліся традыцыйных поглядаў і звычак, не пралі і не ткалі. Хто і падхапіў традыцыю вырабу карунак для ўбрання ложкаў, потым сталі вязаць зусім іншыя, па-свойму прыгожыя і поўнасцю карункавыя абрусы і сурвэткі, спачатку, па звычаю, белыя, а потым і каляровыя – пасля вайны, з новых часопісаў і кніг па рукадзеллі.

**Заключэнне.** XXI стагоддзе прынесла свае шматлікія штучныя і тэхнакратычныя, урбаністычныя перамены. Вярнуліся на пачэснае месца іконы, і вырабляюцца новыя набожнікі з нязменна-неабходнымі карункамі. Складваюцца спрыяльныя ўмовы для нараджэння добрых жыццёвых традыцый ва ўмовах шаноўных адносін да старадаўніх адноўленых рамёстваў. Сёння самадзейныя аматаркі пляцення і вязання маюць вялікую варыятыўнасць выбару матэрыялаў, тэхнічных прыёмаў, доступ да літаратурных, часопісных і інтэрнэтных навінак рукадзелля. Плённа працуюць розныя творчыя аб’яднанні, клубы па інтарэсах і гурткі. Сучасная мода ў адзенні аддае перавагу мяккаму і пластычнаму трыкатажнаму тэкстылю перад тканінай. Асаблівым попытам у знатакоў карыстаюцца рукатворныя вязаныя кручком і на прутках прадметы адзення, плеценыя вузялковыя аксесуары, па-ранейшаму прадаўжаюць вырабляць карункавыя сурвэткі, настольнікі і фіранкі для сучасных інтэр’ераў у этнастылі.

Спіс літаратуры

1. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности // Этнографические данные. Витебск, 1895
2. Шейн П. В. , Белорусский сборник, т. III, СПб, 1903. Сообщ. А.Фр. Лисовской.



Репозиторий ВГУ